## РЭФЕРАТ

Справаздача 80 с., 1 кн., 60 крын.

СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА, ПІСЬМЕННІКІ БРЭСТЧЫНЫ ЖАНР, ВОБРАЗ, ПСІХАСАЦЫЯЛЬНАЯ ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ, САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ, ЧЫТАЦКІЯ ЗАЦІКАЎЛЕННІ, МОЛАДЗЬ, ПРОЗА, ДРАМАТУРГІЯ

Аб’ектам даследавання з’яўляюцца сацыяльна-культурныя арыенціры моладзі ў празаічных і драматычных творах пісьменнікаў Брэстчыны канца XX – пачатку XXI стагоддзя.

Мэта – вызначэнне асаблівасцяў мастацкага адлюстравання сацыяльна-культурных арыенціраў моладзі ў сучаснай літаратуры Брэстчыны.

Метадалогія і метады даследавання. Сучасная літаратура для моладзі брэсцкіх мастакоў слова разглядаецца на аснове сістэмнага падыходу да з’яў літаратуры, выкарыстоўваюцца гісторыка-функцыянальны, параўнальна-тыпалагічны, герменеўтычны, рэцэптыўна-камунікатыўны літаратуразнаўчыя метады пры аналізе з’яў, фактаў і твораў.

У працэсе працы выяўлены найбольш важныя сацыяльна-культурныя арыенціры моладзі ў творах В. Гапеева, З. Дудзюк, У. Гніламёдава, А. Крэйдзіча, К. Каліны, Г. Марчука, І. Сідарука, А. Іванова, М. Туруноўскага, Ц. Ііеўскага і іншых.

У выніку даследавання ўпершыню ў творах сучасных брэсцкіх пісьменнікаў асэнсаваны асаблівасці мастацкага адлюстравання праблем псіхасацыяльнай ідэнтыфікацыі, фарміравання маральнай, эстэтычнай і экалагічнай культуры, здаровага ладу жыцця, патрыятычнага выхавання, полікультурнасці і інш.

Ступень укаранення – выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе БрДУ імя А. С. Пушкіна: пры падрыхтоўцы да лекцыйных і практычных заняткаў па курсах “Літаратура бліжняга замежжа”, “Гісторыя рускай літаратуры (канец XX–XXI ст.)”, “Дзіцячая літаратура (Беларуская дзіцячая літаратура)”. “Дзіцячая літаратура (Руская і замежная дзіцячая літаратура)”, “Методыка выкладання беларускай літаратуры” “Методыка выкладання рускай літаратуры”, у адукацыйным працэсе гімназіі № 2 г. Брэста пры выкладанні беларускай літаратуры.